УДК 930.23(438): “1921/1939”

# ПРАБЛЕМА СКЛІКАННЯ САБОРУ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ ЯК ЭЛЕМЕНТ НАЦЫЯНАЛЬНА-КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ ПОЛЬСКІХ УЛАД (1921–1939): ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ[1]

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч,**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вывучэнню польскай гістарыяграфіі спробы склікання сабору праваслаўнай царквы ў міжваеннай польскай дзяржаве ў кантэксце ўрадавай нацыянальна-канфесійнай палітыкі адносна праваслаўнага беларускага і ўкраінскага насельніцтва.*

Ад пачатку аднаўлення дзяржаўнасці ўрад Польшчы сутыкнуўся з праблемай вырашэння пытання прававога становішча праваслаўнай царквы, вернікамі якой з’яўляліся ў асноўным беларусы і ўкраінцы. У сувязі з гэтым перад уладамі стаяла задача юрыдычна, арганізацыйна і тэрытарыяльна прыстасаваць царкву да ўмоў польскай дзяржаўнасці, але заканадаўчага акта, які б вызначаў становішча царквы і прынятага ў адпаведнасці з нормамі Канстытуцыі ў 1920-я гг. так і не з’явілася. У гэтых умовах праваслаўныя іерархі спрабавалі склікаць царкоўны сабор для аказання ціску на ўлады і ўзмацнення сваёй пазіцыі. Артыкул прысвечаны адлюстраванню інтэрпрэтацыі гэтай падзеі ў польскай гістарыяграфіі.

Даследчык канфесійнай гісторыі К. Красоўскі, сцвярджаў, што пасля майскага перавароту 1926 г. вялікую актыўнасць у вырашэнні праблемы праваслаўнай царквы разгарнула МУС. Прапаноўвалася канчаткова вырашыць праблему юрыдычнага становішча царквы і пытання фінансавання духавенства, бо на думку міністэрства: «Існуе небяспека, што калі дзяржава не аточыць апекай царкву і духавенства, то яно можа перайсці да палітычнага лагера беларускай і ўкраінскай меншасці, чаго дзеячы нацыянальных меншасцей дамагаюцца» [1, с. 170].

Гісторыю ідэі сабornasці ў міжваеннай Польшчы аналізавала М. Папежыньска-Турэк. Яна адзначала, што першыя спробы склікання Сабору ў польскай дзяржаве былі зробленыя яшчэ ў 1920 г. епіскапам Уладзімірам. Аднак яго не падтрымалі дзяржаўныя ўлады і іншыя епіскапы. У пачатку 1923 г. на пасяджэнні Сінода была прызнана неабходнасць склікання Сабору. Сінод пастанавіў распачаць падрыхтоўку. Пасля забойства мітрапаліта Георгія гэта пытанне зноў набыло актуальнасць. Беларускія і ўкраінскія паслы ў Сейме прапанавалі ўраду дазволіць правесці агульнадзяржаўны царкоўны сходу. 6 ліпеня епіскап Аляксей падрыхтаваў праграму і рэгламент Сабору, якія былі зацверджаны Сінодам. Адначасова ішла актыўная праца ў кірунку абвяшчэння аўтакефаліі, якая выклікала шырокія дыскусіі

[1] Даследаванне выканана пры падтрымцы БРФФД у рамках навуковага праекта Г20Р-011.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў грамадстве, а ўрад рабіў першыя крокі да падпарадкавання царквы. Лічачы, што Сабор можа быць выкарыстаны супраць улад, яны адмовілі ў дазволе на скліканне. Толькі ў 1928 г., калі выявілася, што паразумення паміж царквой і дзяржаўнымі ўладамі немагчыма дасягнуць, іерархі зноў згадалі пра Сабор. У 1929 г. становішча Праваслаўнай царквы пагаршаецца яшчэ больш, бо каталіцкія епіскапы распачалі чарговую акцыю па рэвіндыкацыі праваслаўных святынь. Праз скліканне Сабору планавалася паказаць сілу царквы, шчыльную сувязь вернікаў з іерархіяй, а таксама стварыць умовы для больш карыснага вырашэння актуальных для царквы пытанняў. Сабор планавалася выкарыстаць у як інструмент барацьбы з Каталіцкай царквой і ўрадам, прыцягнуўшы і свецкі элемент [2, с. 165-166].

К. Красоўскі сцвярджае, што ўлады былі выразна супраць ідэі склікання сабору. Міністр веравызнанняў С. Чэрвінскі у лісце ад 21 снежня 1929 г. да мітрапаліта Дзіянісія забараніў правядзенне выбараў удзельнікаў Сабора, адначасова выдаючы ўказ ваяводам аб недапушчальнасці правядзення прыхадскіх сходаў [1, с. 171].

Беларускія паслы накіравалі ў Лігу Нацый запыт, дзе абвінавачвалі ўрад у супрацьдзеянні арганізацыі Сабору. МЗС, даючы тлумачэнні, адказвала, што ўлады не чыняць перашкод, а арганізацыі Паместнага сабору перашкаджаюць спрэчкі паміж вышэйшым духавенствам і вернікамі ў пытанні саборнасці і ўдзелу свецкіх асоб, супраць чаго выступаюць іерархі [3, арк. 183].

На думку К. Красоўскага, вялікую ролю ў выхадзе з крызісу, у якім апынуліся дзяржаўна-царкоўныя стасункі, адыграў Г. Юзэўскі, прызначаны ў снежні 1929 г. на пасаду міністра ўнутраных спраў. Быў ён прыхільнікам ідэі саборнасці царквы і выступаў за нармалізацыю адносін з Праваслаўнай царквой. Дзякуючы яму наблізіліся пазіцыі ўрада і епіскапата [1, с. 172].

Як паказваў А. Мірановіч, у выніку кампрамісу паміж уладамі і царквой была створана спецыяльная камісія з прадстаўнікоў урада і царквы. Змешаная камісія распрацавала новы рэгламент і выбарчы парадак на Сабор, а таксама яго праграму. Было вызначана, што на Агульным Саборы суадносіны паміж духавенствам і свецкімі асобамі павінны быць 2:3 (на двух святароў павінны прыпадаць тры цывільных) [4, с. 114].

Праца камісіі спрычынілася да абвяшчэння 30 мая 1930 г. адозвы Прэзідэнта Польскай Рэспублікі І. Масціцкага да мітрапаліта Дзіянісія. Яна дазваляла скліканне Агульнапольскага сабора з прадсаборным сходам, які павінен быў яму папярэднічаць. Е. Лангрод свяртаў увагу як выкарыстоўвалася гістарычная аргументацыя для неабходнасці склікання сабору. Так у адозве сцвярджалася: «15 чэрвеня 1791 г. пад апекай урада Рэчы Паспалітай быў адкрыты ў Пінску апошні Сабор Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Па Боскай волі Святая Аўтакефальная Праваслаўная царква ў Польшчы можа звярнуцца да свайго гістарычнага мінулага. Зараз прыйшоў час, каб былі здзейснены памкненні Глаў Праваслаўнай царквы ў асобах мітрапаліта Георгія і Вашага Высокапраасвяшчэнства, як і Св. Сінода Епіскапаў і ўсіх грамадзян Рэчы Паспалітай праваслаўнага веравызнання, каб згодна са Святымі Канонамі Святая Аўтакефальная Праваслаўная царква ў Польшчы правяла свой Сабор, першы ў адроджанай Польскай Дзяржаве» [5, с.136].

Улады імкнуліся выключыць з праграмы Сабору праблемы вельмі істотныя для Праваслаўнай царквы: аб прававым становішчы царквы, царкоўнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уласнасці, судовыхісках Каталіцкай царквы ў справах рэвіндыкацыі, аднаўлення і закладання новых прыходаў.

А. Мірановіч адзначаў, што праца ў камісіях прадсаборнага сходу ішла вельмі павольна. За пяць год толькі камісіі па пытаннях рэлігіі, асветы, прыхадскога і манастырскага жыцця і па справах духавенства распачалі спробы вырашэння пастаўленых задач. У той жа час абедзве юрыдычна-арганізацыйныя камісіі, якія павінны былі прадставіць праект найважнейшых рэформ у царкве, не распачалі працу [4, с. 117].

Такім чынам, нягледзячы на вялікую прыхільнасць да ідэі Сабору ў духавенства і вернікаў, да яго склікання не дайшло. Польскія гісторыкі згодны, што працы прадсаборнага сходу замаруджваліся дзяржаўнай адміністрацыяй. Улады не жадалі дапусціць правядзенне Сабору, калі яны самі не мелі распрацаванай канцэпцыі адносна Праваслаўнай царквы. Урад быў занепакоены верагоднай арганізацыяй агульнага сходу духавенства і міран Польшчы, бо епіскапат імкнуўся выкарыстаць Сабор для барацьбы супраць польскай дзяржавы і Каталіцкай царквы, выразным пазначылася таксама было імкненне беларускіх і ўкраінскіх палітычных колаў да надання царкве нацыянальнага характару.

Аднак былі і станоўчыя вынікі. У царкве і грамадстве зацвердзілася ідэя саборнасці, што павінны былі ўлічваць улады пры зацвярджэнні ўнутранага статута царквы. Пасля перапынку зноў пачаліся перамовы аб унармаванні прававога становішча Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Акрамя таго, сярод праваслаўнага насельніцтва пашырылася перакананне, што ўрад імкнецца не дапусціць свецкага элемента ў кіраванні царквой і праводзіць палітыку ўціску і абмежавання праваслаўя.

## Літаратура


1. Krasowski, K. Związki wyznaniowe w II Rzeczypospolitej. Studium hist.- prawne / K. Krasowski. – Warszawa ; Poznań : PWN, 1988. – 354 s.

2. Papierzyńska-Turek, M. Między tradycją a rzeczywistością. Państwo wobec prawosławia w 1918–1939 / M. Papierzyńska-Turek. – Warszawa : PWN, 1989. – 482 s.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2059. – Воп. 1. – Спр. 1.

4. Mironowicz, A. Kościół prawosławny na ziemiach polskich w XIX i XX wieku / A. Mironowicz. – Białystok : Wydaw. Uniw. w Białymstoku, 2005. – 379 s.

5. Langrod, J. O Autokefalii prawosławnej w Polsce : studium z zakresu polskiej polityki i administracji wyznaniowej / J. Langrod. – Warszawa : Druk. «Bibl. Polska» w Bydgoszczy, 1931. – 170 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова